Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
12.11.2017 00:00



Абавязковай умовай для таго, каб поўнасцю даверыцца міласэрнаму Богу, з’яўляецца пастава пакаяння і ўбоства. Старонкі Новага Запавету, пачынаючы з апісання таямніцы нараджэння Пана ў беднай стайні ў Бэтлееме ажно да Яго апошніх хвілін, заклікаюць нас да пераймання Езуса ўбогага.

Убоства Збаўцы заключалася, перш за ўсё, у абсалютным даручэнні сябе Айцу. Падчас смерці на крыжы ў поўнай адзіноце Хрыстос “выракся самога сябе, прыняўшы постаць слугі” (Флп 2, 7). Нічога для сябе не пакінуў. Менавіта на гэтым палягае сапраўдная любоў. Пан Езус вучыць нас заўважаць малое, нязначнае ў вачах свету. Гэта надзвычай важна сёння, калі разам з вялізнымі гандлёвымі цэнтрамі расце таксама беднасць, прычым часта ўтоеная з-за нясмеласці ці сораму, што чалавек сам не дае сабе рады. † Хрыстос гаворыць:

“Не турбуйцеся аб сваім жыцці, што будзеце есці, і пра цела, у што апранацца. Бо жыццё важнейшае за ежу, а цела – за вопратку” (Лк 12, 22–23). Перасцерагае таксама, што багачам цяжка ўвайсці ў Божае Валадарства (параўн.:

Мц 19, 23–26), паколькі яны не разумеюць, што гэта дар, які нельга купіць за грошы.

Толькі калі чалавек не абцяжараны багаццем і ахвяруе Езусу ўсё, Хрыстос напоўніць яго душу спакоем, якога свет не можа даць. Аддаючы Усявышняму тое, кім з’яўляемся і што маем, дазваляем нарадзіцца ў нас Божай радасці і духоўнай лёгкасці. Цешымся кожным дарам, нічога не ўспрымаем як сваю выключную ўласнасць.

Сэрца ўбогага чалавека вольнае ад хцівасці, таму што здольна цешыцца тым, што мае (параўн.: Гбр 13, 5). Яно даверліва моліцца словамі малітвы Панскай: “Хлеба нашага штодзённага дай нам сёння”. Не клапоціцца занадта пра сваю будучыню. Не прагне багаццяў, бо яму хапае блізкасці з убогім Езусам, прысутным у таямніцы Эўхарыстыі.

Касцёл, як і яго Заснавальнік, падтрымлівае ўбогіх: “Як Хрыстос здзейсніў справу адкуплення ва ўбостве і сярод гаценняў, так і Касцёл пакліканы ўвайсці на той самы шлях, каб удзяляць людзям плён збаўлення” (II Ватыканскі сабор, Lumen gentium, 8). “Ах, як жа я прагну, каб Касцёл быў бедным і для бедных”, – прызнаўся Святы Айцец

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
12.11.2017 00:00

Францішак падчас сваёй першай сустрэчы з журналістамі. А на інаўгурацыйнай св. Імшы ён сказаў, што як Папа хоча “з любоўю і чула- сцю прыняць усё чалавецтва, асабліва найбяднейшых, найменшых, самых слабых, тых, каго св. Мацвей апісвае як галодных, спрагнёных, падарожных, голых, хворых, у вязніцы”.

Дарагія Чытачы!

Вучань Езуса не павінен быць абыякавы да лёсу ўбогіх. Нельга забываць словы Хрыста: “Тое, што вы зрабілі аднаму з гэтых братоў Маіх меншых, вы Мне зрабілі” (Мц 25, 40).

Давайце памятаць пра бедных і патрабуючых у сваіх малітвах. Няхай усё наша жыццё стане адданай службай бліжняму!